***Любчанка А. А. (Мінск, Беларусь)***

# АПАВЯДАННЕ В. БЫКАВА «ТРУБА» Ў АСПЕКЦЕ ПРАБЛЕМ ЭКЗІСТЭНЦЫЯЛІЗМУ

Васіль Быкаў – выбітны беларускі пісьменнік, класік нацыянальнай літаратуры, у творах якога па-мастацку аналізуюцца паводзіны чалавека ў складаных сітуацыях. Пісьменнік вельмі часта ўздымае пытанні, тыповыя для экзістэнцыяльнай філасофіі, таму многія лічаць яго галоўным экзістэнцыялістам беларускай літаратуры. Апавяданне «Труба» – адзін з позніх твораў В. Быкава, у якім аўтар закранае не традыцыйную для яго тэму вайны, а звяртаецца да праблем сучаснасці. На прыкладзе жыцця «маленькага чалавека» Валеры Сарокіна пісьменнік даследуе наступныя экзістэнцыяльныя праблемы: свабода чалавека, цяжкасць экзістэнцыяльнага выбару, адказнасць асобы перад грамадствам і наадварот, паводзіны чалавека ў памежнай сітуацыі.

Сюжэт апавядання «Труба» складае «жыццяпіс» Валеры, звычайнага на першы погляд чалавека, загадчыка клуба ў перадавым калгасе. У грамадстве Валера не меў пачэснага месца, але і не адносіўся да сацыяльных нізоў, бо ён «інтэлігент з вышэйшай адукацыяй». Ён поўнасцю задаволены тым, што мае: жонку, двое дзяцей, якую-ніякую працу. «*Сціплая, праўда, пасада, ды лепшай для яго не знайшлося, дзякуй і за гэтую*» [1], – разважаў Валера. Ён не лічыў сябе баякам ці дурнем, асабліва, калі вып’е. Пасля чарговай імпрэзы Валера, п’яны і мокры ад дажджу, зайшоў у гразкае месца па дарозе дамоў. Надвор’е не пакідала яму выбару, і ён вырашыў перачакаць моцны дождж у яшчэ не заваранай трубе, якая была часткай новага газаправоду. Валера заснуў, а калі прачнуўся зразумеў, што не ведае, куды ісці: пакуль галоўны герой спаў, трубу заварылі, і яму заставалася толькі спадзявацца на выратаванне. За доўгія гадзіны, праведзеныя ў пастцы, жыццё пранеслася перад вачыма Валеры, яго стан пастаянна змяняўся.

Спачатку яго турбавалі сумненні: у які бок ісці, што рабіць з ежай, ці варта крычаць аб дапамозе. У Валеры была непахісная надзея на паратунак, аднак ён не зусім разумеў становішча, у якім апынуўся, усё нібы ішло па-старому. Для перадачы думак і перажыванняў галоўнага героя В. Быкаў на працягу ўсяго апавядання ўжывае няўласна-простую мову: «А можа быць ён проста палез не ў той бок і яшчэ не дайшоў да праклятага стыку?» [1].

Калі алкагольнае ап’яненне поўнасцю сышло, Валера пачаў думаць пра свае грахі, бо «ўласныя хібы па п’янцы яго мала кранала». Да яго прыходзіла пакаянне: «Усё ж кепская гэта справа – п’янка» [1]. Пасля ўсведамлення экзістэнцыяльнай абсурднасці сітуацыі, у якой ён апынуўся, разам з пакаяннем Валера адчуў страх, трывогу, «спалох ад адзіноты і пакінутасці». Ён усё яшчэ не мог пагадзіцца з думкай, што яго назаўсёды заварылі ў трубе, таму пачаў крычаць, разлічваючы на дапамогу, «замітусіўся, разгубіўся, запанікаваў». Яму не заставалася больш нічога, акрамя спадзяванняў.

Пасля невялікага бунту пакаянне Валеры самому сабе працягнулася. Ён узгадваў пра тое, як тайна, хоць і не па сваёй волі, пачаў супрацоўнічаць з КДБ, як пабаяўся падняць руку на камуніста, а летам не насыпаў гравію пры ўваходзе ў клуб. Прыгадаў Валера і маці, якой не рашыўся дапамагчы, пабаяўшыся ўласнай жонкі. Пэўнай нерашучасцю і страхамі было прасякнута усё жыццё Валеры: «Для яго ў гэтым жыцці шчасцем-удачай было б не ўліпнуць у якую гісторыю» [1]. Яго нельга было назваць недалёкім чалавекам, бо ён з самага пачатку прадбачыў крах сістэмы і нават аднойчы паспрабаваў пайсці ёй насуперак, за што быў выключаны з партыі. Аднак нерашучасць Валеры заўсёды пакідала яго на памежжы, не давала стаць сапраўднай моцнай асобай, адчуць экзістэнцыяльную свабоду. Праблема выбару напрамку пры пошуку



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

выйсця з трубы аказалася ўвасабленнем усяго яго жыцця: «Самы элементарны выбар – адзін варыянт з двух, і на той ён аказаўся няздольны» [1].

Паніка Валеры станавілася мацнейшай: «Ён пачаў крычаць штосьці невыразнае, самому незразумелае» [1]. З гэтага моманту галоўны герой пакрысе губляў надзею: «Так крычаць хутка яму надакучыла, захацелася хоць якога сэнсу ў гэтым выратоўчым крыку» [1]. Адчуваючы ўсё больш адчай у памежнай сітуацыі, Валера прыйшоў да думкі, якая заключае ў сабе адну з галоўных экзістэнцыяльных ідэй твора – важнасць звычайнага чалавека ў маштабе вялікай справы: «Што ім нейкі дурны туземец, які трапіў у бяду па п’янцы – сельскі загадчык клуба Валера!» [1]. Дзеля яго наўрад ці сталі бы пілаваць трубу, нават калі б пачулі яго крыкі: «Але хто тыя, што былі наверсе? Хоць бы проста нармальныя людзі, а то ўсё вар’яты» [1]. Узгадваючы тых, хто «наверсе», Валера меў на ўвазе не толькі газавікоў, а таксама і несумленных палітыкаў. Ён заўсёды ставіўся да іх з непавагай, вось толькі баяўся пра гэта адкрыта казаць. Пытанне, ці вартае жыццё Валеры тых тысяч даляраў, што былі ўкладзены ў праект, турбуе галоўнага героя і пазбаўляе яго сіл для далейшага змагання.

У апавяданні В. Быкаў выкарыстоўвае не толькі няўласна-простую мову, але і плынь свядомасці. На розных этапах сваёй псіхалагічнай трансфармацыі Валера прыходзіць да глыбокіх высноў праз раптоўныя разважанні. У іх ён часта крытыкуе ўлады і дзейнасць сваёй жонкі – правільнай камуністкі, якая гатова на ўсё, толькі б не адарвацца ад народа. Пакорлівасць у ім з часам замяняецца бунтам, а далей – агрэсіяй. Валера пагражае ўзарваць трубу і невядома нашто выдумляе, што ў яго ёсць запалкі: «Можа, хоць пагроза аварыі кране іх ачарсцвелыя душы» [1]. З поўным адчаем у памежнай сітуацыі герой, які ў звычайным жыцці плыў па цячэнні, не перастае чапляцца за рэшткі надзеі любымі, нават самымі абсурднымі, спосабамі.

Ні адна спроба выкараскацца не спрацавала: «Калі не атрымалася ва ўсёй краіны, наўрад ці можна было чакаць удачы для асобна ўзятага грамадзяніна» [1]. Станы Валеры змяняліся па коле. Агрэсіўны бунт змяніўся на думкі пра жаданне жыць. Крычаць ён больш не мог, але рабіў гэта, бо нічога больш не заставалася: «Хіба зноў крычаць? І ён зноў закрычаў, прыкметна, аднак, паглушэлым голасам» [1]. Адсутнасць веры героя ў цуд пераклікалася з тагачаснымі тэндэнцыямі ў грамадстве, калі людзі, якія нейкі час таму былі бязбожнікамі, знянацку тлумам пайшлі ў наноў адбудаваныя цэрквы. Валера лічыў такія паводзіны чыстым падманам: «Валеру ж тут прытварацца не было патрэбы» [1]. Ён не мог падманваць кагосьці і больш не хацеў падманваць сябе. Жаданне жыць не давала яму сядзець на месцы, бо маленькая спадзеўка яшчэ была недзе ў глыбіні яго свядомасці: «Палез па трубе – няважна ў які бок, абы не сядзець на месцы» [1]. У стане поўнага адчаю жаданне Валеры жыць абвастрылася яшчэ больш: «Ды хоць бы прамок да касьцей, ухапіў прастуду, грып ці яшчэ якую халеру, можа б, урэшце як-небудзь выкараскаўся. А во як выкараскаешся адсюль, калі прапаў выхад?» [1].

Надзея Валеры канчаткова знікла. Застаўшыся сам на сам з сабой і сваім страхам, ён раптам адчуў тую сілу, якой яму вострa не хапала ў жыцці: «Цяпер ён вызваліўся ад усяго. І ад страху таксама» [1]. Каб адчуць сябе свабодным і незалежным, яму трэба было апынуцца ў замкнёнай прасторы. Асаблівасць разумення В. Быкавым паняцця свабоды адзначае ў сваёй працы даследчыца творчасці пісьменніка Ю. Каламійцава: «Быкаўская інтэрпрэтацыя свабоды звязана з неабходнасцю «зрабіцца часткай натоўпу», каб потым вырвацца з яго» [2, с. 75]. Ад пачуцця ўласнай свабоды Валера адчуў нейкую вар’яцкую эйфарыю, пасля якой бунт змяніла прыняцце, што недапушчальна, згодна з экзістэнцыяльнай філасофіяй. Труба вырвала Валеру з рэчаіснасці і паставіла яго перад тварам уласнай экзістэнцыі. Ён адчуў, што стаў недасяжным для ўсіх праблем і страхаў. «Упершыню ў жыцці Валера Сарокін набыў голас і з ім стаў



адважным» [1]. Яму хацелася крычаць, бо ён так доўга маўчаў. Вось толькі было ўжо надта позна. Валера стаміўся паўзці без выніку, лёг, і праз тыдзень яго цела выцягнулі з трубы. Невядома, ці змянілася б жыццё Валеры, калі б ён змог выкараскацца, ці захаваўся б яго свабодны і незалежны голас. Адно вядома дакладна: ён дзвесце метраў недапоўз да месца паратунку, прыняўшы сваю смерць. Ён асэнсавана развітваўся з жыццём: «Што яму там, у жыцці? Згрызоты і няволя» [1]. Магчыма, яго адчуванне экзістэнцыяльнай свабоды было сапраўдным, а, быць можа, прычынай гэтага стану стала поўная расчараванасць. Адкрытым застаецца пытанне, ці варта было яму працягваць спадзявацца ў безвыходнай сітуацыі і шукаць з яе выйсце да апошняга ўздыху. Улічваючы тое, што выйсце насамрэч было.

Вобраз трубы ў творы вельмі сімвалічны і функцыянальна значны: яна ўяўляе сабой замкнёную прастору, дзе можна рухацца нібы наперад, а насамрэч толькі аддаляцца ад мэты. Адсюль вынікае яшчэ адна яскравая аналогія трагедыі Валеры з сітуацыяй у грамадстве: яно, разам са сваімі лідарамі, нярэдка блукае ў цемры без упэўненасці ў правільнасці абранага накірунку. Будучыня пры такім становішчы, як і ў Валеры Сарокіна, бачыцца страшнай і непрадказальнай.

В. Быкаў у апавяданні «Труба» неаднойчы праводзіць трапныя паралелі з тагачаснай палітычнай сітуацыяй. Назва калгаса, дзе працаваў Валера, таксама сімвалічная – «Шлях да камунізму». Дарога Валеры дамоў, як і шлях да камунізму, была поўная цяжкасцей і перашкод, а ў выніку прывяла да трагедыі. З гэтай сітуацыі было выйсце, але цяжэй за ўсё для героя аказалася захоўваць веру ў паратунак. Валера прыйшоў да думкі, што менавіта ў трубе ён адчувае сябе свабодным. Ён супакоіўся і вырашыў больш не змагацца, хаця газ па трубе яшчэ не пусцілі, а значыць была магчымасць ісці да канца. Пісьменнік пакідае адкрытым пытанне пра справядлівасць чалавечай ахвяры ў маштабе раёна, вобласці ці цэлай дзяржавы.

Пісьменнік уздымае экзістэнцыяльную праблему выбару Валеры Сарокіна, які стаяў паміж амаль бессэнсоўным змаганнем і смерцю з адчуваннем уласнай вартасці. Разам з тым у творы закранаецца пытанне пра ролю адной асобы ў глабальным працэсе. Экзістэнцыяльная праблема цяжкасці барацьбы ў абсурдным становішчы таксама знаходзіць адлюстраванне ў творы. Пісьменнік яскрава паказвае, што часта толькі ў памежнай сітуацыі чалавек становіцца максімальна дзейсным і пачынае адчуваць уласную вартасць. У творы раскрываецца праблема адсутнасці экзістэнцыяльнай свабоды чалавека ў гэтым свеце. Сярод фактараў, якія абмяжоўваюць свабоду, можна вылучыць ціск з боку грамадства, улады і ўнутраныя абмежаванні асобы. В. Быкаў паказвае, што ў звычайным існаванні большасць імкнецца захоўваць нейтралітэт ва ўсім, а жыццё праплывае міма. Валера ўсвядоміў нязначнасць жыццёвых праблем толькі тады, калі яны яго больш не маглі кранунь па прычыне поўнай адарванасці ад свету, а пасля – па прычыне смерці.

### *ЛІТАРАТУРА*


1. Быкаў, В. Труба [Электронны рэсурс] / В. Быкаў // Беларуская палічка: беларуская электронная бібліятэка. – Рэжым доступу: http://knihi.com/Vasil_Bykau/Truba.html. – Дата доступу: 14.08.2018.
2. Каламійцава, Ю. Праблема свабоды ў творчасці Васіля Быкава / Ю. Каламійцава // Философия и социальные науки: научный журнал. – 2009. – № 1–2. – С. 73–77.




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ